Poczta opłacona ryczałtem.

Адзін № каштуе 35 гр.

№ 5. |6|. Серада 18-га Сакавіка 1925 г. Год II.

Авадзень


ДВАТЫДНЁВІК САТЫРЫ, ЖАРТАЎ І СЬМЕХУ.

Чым цяпер займаюцца некаторыя безработныя інтэлігенты нашы на вёсцэ.



...Толькі памагаюць катам у іхняй марцовай музыцы.


БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ ХОЧУЦЬ...



1.


За Царом яшчэ Міколам
Тут калісьці была школа,
- - - - - - - - - -
- - - - - - - - - -
Дзеці ў школу не хадзілі,-
Вось як школу апусьцілі.

2.




2.

Янка, Тодар, дзядзька Клім
Доўга думалі аб тым,
Як бядзе тэй пасабіць,-
Школу родную адкрыць:
Каб, урэшце, ясна сонца
Засьвяціла нам ў ваконца
І асьветы промень ясны
Беларус пазнаў нішчасны.



3.

Вось парады у думках гэтых
Пачалі шукаць у газэтах...
І чытаюць, што наўкола
Паўстае радная школа,
Толькі трэ сабраўшы сход
Напісаць, што сам народ
Ab асьвеце ўсе клапоча,-
Беларускай школы хоча.




1.

Вось, па солтыса загаду,
Саоралісія ўсе на раду
І зрабілі прыгавор:
Каб у весцы „Чорны Бор"
„Школу родную адкрыць...
Галавы каб не дурыць
Сваім дзеткам так на волі...
Хочэм школы і ..даволі."



5.

Дзядзька Клім і Тодар з Янкам
У дарогу выйшлі ранкам,
Каб прад панам інспекторам
Быць назаўтра с прыгаворам.
І прийшлі яны да мэты
Ды знайшлі будынак гэты,
Прастаялі там ад раньня
Без гарбаты і сьняданьня.



6.

Увайшлі яны за дзьверы
Падалі свае паперы
І пачулі яны ўраз
Міласьцівейшы адказ:
- Добра, добра, мае людзі!
„Хай па вашаму ўжо будзе,
Толькі трэба пачэкаць-!"
(Так гадкоў мо з дваццаць пяць..)

А. МАЛАНКА.

УСПАМІН АБ КАРНАВАЛЕ.

Не адзін можа ўздыхае і жалее, што прайшоў мясаед,а з ім балі і гульні.Я дык дзякую Богу,што ўжо пост і німа баляў.Адзін успамін аб мясаедзе мяне трасе...

Насам-перш,хачу з чытачом па знаёміцца і адрэкамэндаваць сябе, хто я такі...Дзе я радзіўся і калі-ніяк ня помню,а жыву,дзякуй Богу,не на Лукішках.Мая прафесія,пытаецеся вы?Ах Божа!на вошта вам гэта ведаць?Досыць таго,што я жыву у Вільні і,дзеля тэй простай прычыны,маю многа маладых знаёмых|асабліва дзяўчат|,а колькі іх было?!.не пералічыць і ня ўспомніць.Ды ціж аб усім можа чалавек помніць!Вось напрыклад,запытайцеся пана куратора:колькі у яго лічыцца вучыцелькаў-напэўна ня помніць,а нашто ужо чалавек з галавой і вучоны.Адным словам,вам скажу,што была у мяне знаёмая Марылька,Стэфка,Зоська,Суська,..

З пачатку было мне добра . Знаемства мае павялічвалася,ахвўлялася балямі,скокамі...Адна знаёмая мая служыла у тэлеграфе,другая-на тэлефоне,трэйцяя -у банку, у судзе.і.т.д...А трэба-ж вам ведаць,што кожная інстытуцыя у Вільні ладзіць што год балі,гульні,а ўсё у мясаедзе.На што гэта ім-Бог іх ведае!Мусіць проста так, адзін ад другога бяруць прыклад: скача дзедка,чаму не мае скакаць бабка,скача Варшава,чамуж ня можа паскакаць і Вільня.Дык вось і я з маімі знаемымі з аднаго балю на другі:з тэлефону у тэлеграф,з тэлеграфу у банк,з банку у суд,з суда у...і так далей і так што дзень скокі ды скокі.

Была у мяне [ах,мілы успамін.] адна кілбасьніца,таксама знаёмая,Стэфка з Кальварыйскай вуліцы|помню нат і № дому 24|.

Чаму кілбасьнікі не ладзілі балю гэтага я ніяк ня мог даведацца Мо дзеля таго,што яны усе тлустыя і ім трудна скакаць,ці мо,як кажуць злыя людзі ,ні было-б нас каму абдзіраць у мясаед,калі-б і кілбасьнікі скакалі...У гэта я усёткі,ня веру,бо мая Стэфка|ах ужо не мая,толькі ўспаміны|была для мяне вельмі шчодрая:патрэбны мне былі на баль новыя лякеркі-

- - - - - - - - - - - - - - - - - - - -

купіла,фрак-таксама,гальштучок-і-ёсьць і ён,-словам,ні жалела нічога...

Дык вось,значыцца,кілбасьнікі балю не ладзілі і я да Стэфкі захадзіў,калі балю ні было гэта здарылася аж на самы папелец.

У гэты дзень,як ведама,нідзе ні скакалі і мне было надта маркотна,як зрэдукаванаму чыноўніку. Дай,пайду да Стэфкі,-думаю сабе.Пайшоў я гэта на Кальварыйскую пад № 24|пракляты №,што ні гаварыце,а я цяпер веру ,што ёсьць праклятыя нумары|...

-Ці будзеш есьці халадзец пытае мяне.

-Не!

-Кілбаскі не дастанеш,бо сягоньня пост.|трэба аддаць справядлівасьць-Стэфка была пабожная|

Ні маючы чаго рабіць селі мы, гэта,у куточку і я пачаў яе гладзіць і песьціць ды празываць рознымі зьвярынымі імёнамі:котачкай,ласачкай,ціпачкай і г.д.

З зоолёгіі пераехаў я на астраномію |прыдалася і мне хоць раз навука|...Тут пайшлі і месячык, і сонейка,і зорачкі...А калі я, гэткім парадкам, палез усё вышэй і вышэй,то у мяне ,ад гэтай падарожы закруцілася у галаве горш як на балі...Я забыўся дзе я і з кім.Мне здалося,што я ня з Стэфкай,а з Зоськай і цалуючы у вушка Стэфку назваў Зоськай:„Мая ты мілая Зохначка,"-шапчу я...

Што гэта?Котачка,дагэтуль такая патульная,раптам наёжылася, быццам пачула каля сябе сабаку.

-Ага!-закрычэла яна,-дык у цябе ёсьць і Зохначка!Ах ты!..і з гэтымі славамі яна скочыла да мяне,як пантэра...Разступіся зямля...

Тут я толькі апомніўся,што я зрабіў і дзе я...Мае довады,што я нявінны,як паненка без.. без... без пасагу ,як пан Валэйша без „Грамадзянскага Сабраньня,"нічога не памаглі...Адзін мамэнт-і я знайшоўся,як мыш пад мятлой |толькі не пад мятлой,а пад софай|,а на сваім хрыбце пачуў не пазуркі, а абцасы сваіх лякеркаў,што Стэфка з ног маіх ужо сарвала...

Як я выраўся з ейных рук, як выскочыў на вуліцу бяз ботаў і бяз шапкі, ужо ня помню. Помню толькі: драў так шыбка, што аж самаход дагнаў і, ускочыўшы да яго, троху апомніўся.

-Ці не бандзіты на пана напалі?,-прыглядаючыся пытае мяне нейкая дама.

-Не,-адказаў я.

-А можа спаткаўся пан з чорнай дамай?,-пытае другая.

-А так, з дамай...

-З дамай?-Зачалі усе на мяне як на дзіва прыглядацца.

-Чорная дама паказваецца толькі на магільніку,-абясьніў нейкі яромасьць.

-Дык мусіць она пшэшэдшы на Кальварыйска уліца,-кажа відаць пабялеўшыя іімасьць.

-Быць ня можа! чаму...

-Гальля...-пачуўся голас кандуктара. Я хутчэй шмыгануў у краму, каб за апошнюю залатоўку купіць сабе хоць паношаныя трэпкі...

Дык вось, мае мілыя чытачы! Калі вам здарыцца мець шмат знаёмых -не называйце іх па іменьню, а называйце па зьвярынаму; будзьце асьцярожны і з астраноміяй ды вышэй месячыка ніколі не падымайцеся.

Ваш знаёмы І.Б.

---

oooooooooooooooooooooooooooooooo

Зьехаў з глузду.

-Але-ж украінскі календар на 1925 год пад назовай „Друкар", мусіць з глузду зьехаў.

-Чаму?

-Бо ён дае інфармацыю, што у Піншчыне усе украінцы, а беларусоў ні воднага!

-А як жа-ж?

-Праз мае рукі прайшло вельмі многа дакумэнтаў, дык там напісана у кожнага селяніна усяе Піншчыны што ён беларус!..

-Пык-мык! пык-мык!

Дык-Дзеля.

Ці шадахвоцілі Вы свайго суседа, каб хутчэй выпісаў „А в а д н я"?



ПЕРАД ПАРТРЭТАМ СКАРЫНЫ.


|Адзін з сябраў выдав. Т-ва|

-Дзіва, чаму ты зморшчыўся? Гэта-ж табе трэба толькі цешыцца, што Т-ва зьбіраецца 25 г.м. сьвяткаваць 400 угодкі...

Дух Скарыны: -Я больш быў-бы здаволены убачыўшы вашу выдавецкую кніжну творчасць.-

---

cccccccccccccccccccccccccccc



Пасол Я. Адзначаецца сваёй прамовай і...валасамі.

ДЗЬВЕ МАГЧЫМАСЬЦІ.

Да рабіна прыходзіць адзін яго парахвіянін і просіць рады:

- Пане рабін,-кажа ён,-чуваць, што будзе вайна,а мне падыходзіць час на здачу у войска... Парадзьце,што рабіць,гэта-ж мяне так і-забіць могуць!

- Сын мой,адказвае рабін,-не так усё страшна,як табе здаецца. Перш-на-перш ты маеш дзьве магчымасьці:ці вайна будзе,ці вайны ня будзе.Калі вайны ня будзе-табе ўжо добра,калі вайна будзе,то ты ізноў маеш дзьве магчымасьці: ці цябе на службу прызавуць,ці цябе на службу не прызавуць.Калі цябе на службу не прызавуць-табе ўжо добра,калі цябе на службу прызавуць,тут табе ізноў ёсьць дзьве магчымасьці:ці цябе на Фронт пашлюць,ці цябе на Фронт не пашлюць. Калі цябе на Фронт не пашлюць-табе ўжо добра;калі-ж цябе і на Фронт пашлюць,ізноў ты маеш дзьве магчымасьці:ці цябе на Фронце раняць,ці цябе на Фронце не раняць.Калі цябе на Фронце не раняць-табе ўжо добра,калі цябе на Фронце раняць,ізноў ты маеш дзьве магчымасьці:ці ты ад ранаў памрэш,ці ты ад ранаў не памрэш.Калі ты ад ранаў не памрэш-табе ужо добра;калі-ж ты ад ранаў памрэш, ізноў табе ёсьць дзьве магчымасьці:ці цябе пахаваюць у брацкай магіле,ці цябе пахаваюць на жыдоўскіх магілках;Калі цябе пахаваюць на жыдоўскіх магілках-табе ужо добра;калі-ж цябе пахаваюць у брацкай магіле-яшчэ і тут табе ёсьць дзьве магчымасьці:ці над табой крыж паставяць,ці над табой крыжа не паставяць.Калі над табой крыжа не паставяць-табе ўжо добра; калі-ж над табой крыж паставяць, тады...о-о-о!Тут ёсьць аб чым прызадумацца!

Падаў Гам-чхі.

ГРАМАДЗЯНЕ.

Хто хоча мець „АВАДНЯ" на 2 квартал нехай шлець ураз-жа падпісныя грошы.Сёньняшнім гэтым № пачаўся другі квартал.

ЗАГАДКІ.

1.Чым можа закончыцца гэткая зіма-цеплая і бязсьнежная?
2.Чым пахне гарэлка?
3.Куды воўк цягне ахвяру?
4.Хто першы за злодзеям гоніцца?
5.У якой старане сонца усходзіць?
6.Ад чаго блішчыць месяц?

б...а.

У СУДЗЕ.

У дзяўчыны,каторай хлапец украў грошы з запазухі,судзьдзя пытае:

-Скажыце,як гэта магло стацца? Грошы у вас былі за пазухай,дык трэба было разшпіліць куртку?

-Разшпіліць куртку то я яму пазволіла,думаючы,што ён мае добрыя намерэньні,а ён дык вось,злодзей,украў грошы...

І.В.

Лічба поедыньча і множна.

У школе настаўнік кажа да вучня беларуса:

-Як повеш на келішэк в лічбе поедыньчэй?

Вучэнь вылупіўшы вочы адказуе:

-Ня ведаю,што гэта за „клішак"

-Чым вудкэн піеце?

-А,гарэлку-чаркай.

-Ну,нех бэньдзе чарка.Як чарка-в лічбе множнэй?Як повеш,напшыклад 4,5,10 чарэк?

-Кварта,пане настаўніку.

-А до холеры!Мув:чарка в лічбе множнай бэндзе-чаркі.

-Будуць чаркі.

-Ну,а як бэндзе бутэлька в лічбе мчожнэй?

- Ня ведаю.

Настаўнік злуецца:

-А то,якесь быдле.Я ці выразне вытлумачыл на келішках...

-Не,на чарках.

Настаўнік закіпеў.

-Ну,як ты повеш,ежэлі в якім доме зобачыш дужо бутэлек?

-Піўная,або карчма,пане настаўнік.

Падаў Св.Знаёмы.

ЗГАВАРЫЛІСЯ.

Баба парэзала сярпом палец. Прыходзіць да вучыцелькі і просіць яе памазаць рану ёдам.

Тая,абглядаючы ранены палец, гаворыць:

-Дужо пані вцела (моцна паня урэзала).

-Ага,паненачка,-адказвае баба, -так,так...Крыху ў ногаць,крыху ў цела.

Гам-чхі.

На лекцыі зоологіі.

-Смарчкевіч.Скажы,якія бываюць ракі?

-Ракі бываюць рэчныя,азярныя, марскія і...

-Ну,а яшчэ якія.

-І...

-Ня ведаеш?Цяпкін.Падскажы яму!

-І Ракі-Міхайлоўскія...

П...а

НА ПАЖАРЫ...

-Хлопцы,гміна гарыць!
З усей вёскі бягуць на пажар.
-Не,гэта суд гарыць!
Усе разбегліся,хто куды.

-От,добра,аж з двух бакоў усмалілі!Гэдак і трэба:падумаць толькі,што судзьдзя за глупства штрафуе аж па 2000 зл.,а за неяўку сьведкі-па 50 зл...

НЕ ПЕРАНЁС.

-Чуў,суседзе?-Камандант застраліўся.

-Гм...Што-ж яму за хвароба.

-Усю хату нехта абклеіў за ноч камуністычнай прапагандай,дык ні перанёс,што да гэтага дапусьціўся.

Падаў Дык-Дзеля.

ПАРА,браточкі,АБНАВІЦЬ ПЕРАДПЛАТУ на другі квартал ...



-Відзіш,піша газэта,што Валэйша з Знамяроўскім разыйшліся.

-Гм...Шкадую аднаго і другога.

-Чаму.

-Яны шмат гэтым сабе пашкодзяць.

ооооооооооооооооооооооооооооооооо

І ТО РОЗУМ.

-Зблізаецца канец сьвету-ляціць да Зямлі камета.

-Ня чую ніякай ад гэтага бяды.

-Ого,які ты не пужлівы!

-А на ліха-ж мне пужацца:я яшчэ ні разу не бачыў,што гэта за страх такі-камета.

б..а.

ПАСЛУХМЯНЫ.

Дзяцюк веў на вяроўцыне цялё, каторае так упіралося і кідалося на усе бакі,што ледзь мог яго стрымаць.Ажно падъеджае ураднік.

-Ты чаму шапкі перада мною не зьнімаеш?-закрычэў ён на хлопца.

-А як-жа,зара,зара зьніму шапку,толькі злезьце з возу і патрымайце,каля ласка,цялё,бо рукі маю заняты,-атказывае хлапец.

/"Беларус."/



-Ты обяд хцэш?
-Хцу.
-Цо то за слово хцу? А ты хцэш?
-Хцэш.
-?!!

АДГАДКІ.

1. Вясной. 2. Сьпіртам. 3. У лес. 4. Страх. 5. На усходзе. 6. Ад сонца.

Сярэднія гады.

Прыхсдзіць 92 гадовы старэц зімой да суседа дый кажа:

-Ох, як сьцюдзёна! Гэта-ж у сярэднія гады, але што-ж будзе на старасьць?!

Дык-Дзеля.

-Доконт ты?-пытае паляк сяляніна.
-Але, вязу гонты-адказаў апошні.

Наша Почта.

У Вілейку Гулецкаму для С.М. Пагуды выслана 5 №№ „Авадня", сваім часам-запытайцеся на почце.

Усім тым, што хочуць мець „АВАДНЯ", а ня ведаюць, як пераслаць ґрошы, мы прапануем зьвярнуцца за радай на сваю почту. Як прыйдзе падпіска-за намі дзела не пастаіць.

У гэтым №, на стар. 6 напісана абмылкова-пачаўся другі, трэба лічыць КОНЧЫУСЯ ПЕРШЫ КВАРТАЛ.

Аб атрыманьні падпіскі ужо ня будзем друкаваць, бо шкода мейсца: Хто прышле грошы дык усё роўна будзе акуратна мець АВАДНЯ.

Нашым паважаным мастаком і пісьменьнікам дзякуем шчыра за матарьялы і рысункі і просім прысылаць ящчэ.

Усіх новых падпішчыкаў просім аб паведамленьні адразу, ці ім прысылаць „АВАДНЯ" ад № 1, ці ад дня падпіскі.

Дзеля поўнаты мы раім выпісываць усе №№ спачатку, бо усе яны надта цекавыя і багата люстраваныя.

Рэдакцыя.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Wilno Завальна 7, пры кнігарні.

ПАДПІСКА: на 3м. 1зл. 80гр. на паўгода-3зл. 50гр. на год-усяго 7зл.
За граніцу на год-тры даляры.

Рэдактар-Выдавец А. Васілеўскі.

Літ. Маца, вуліца Домброўскага 3, у ВІЛЬНІ.